**Беатэ Мюлер-Гемэке**
Дэпутатка Бундэстагу Нямеччыны
„Саюз 90/ Зялёныя“

**Берлін**
Platz der Republik 1 - 11011 Berlin
Тэл.: (030) 227 73041
beate.mueller-gemmeke@bundestag.de

**Выбарчая акруга**
Gartenstraße 18 - 72764 Reutlingen
Тэл.: (07121) 9092411
beate.mueller-gemmeke.wk01@bundestag.de

Beate Müller-Gemmeke MdB · Platz der Republik 1 · 11011 Berlin

Ганне Аблаб
СІЗА-3
246003, г. Гомель,
вул. Кніжная, 1А
- Беларусь -

г. Берлін, 20 сакавіка 2023

Дарагая Ганна Аблаб!

Я даведалася, што мае лісты да Вас зусім не даходзяць. Пішу Вам, бо на працягу доўгага часу я з’яўляюся Вашай сімвалічнай палітычнай хроснай. Толькі нядаўна, пасля Вашага прысуду, я адаслала Вам свой апошні ліст.

Зараз мне стала вядома, што Вы нічога не ведаеце пра мае лісты і мой патранаж, Вы наогул не ведаеце мяне. Я з'яўляюся дэпутаткай нямецкага Бундэстагу ад фракцыі партыі “Саюз 90/ Зялёныя” і я ўзяла на сябе абавязкі Вашай палітычнай хроснай, таму што я асабіста выступаю за Вашае вызваленне. Акрамя таго, я спадзяюся, што мая актыўная пазіцыя палепшыць умовы зняволення да Вашага, спадзяюся, хуткага вызвалення. Разам з іншымі дэпутатамі маёй парламенцкай фракцыі я выступаю за неадкладнае вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, якія, як і Вы, так нястомна працуюць на карысць дэмакратыі і правоў чалавека.

Мы атрымалі параду, што нам трэба публікаваць нашы лісты да сваіх хросных у надзеі, што такім чынам Вы нарэшце даведаецеся, што мы намагаліся ўступіць з Вамі у кантакт. І з гэтай нагоды зараз мае лісты да Вас будуць публікавацца. Спадзяюся, што дзякуючы гэтаму ў Вас нарэшце будзе магчымасць адказаць мне: Вы можаце падаць мне знак, як Вашыя справы?

Шчыра спадзяюся, што Вы хутка будзеце на свабодзе, і я таксама запэўніваю Вас, што мы - і я асабіста – у якасці дэпутатаў, па-ранейшаму цвёрда выступаем за Вашае вызваленне і вызваленне Вашых калегаў, якія знаходзяцца ў зняволенні, - і мы будзем рабіць гэта столькі, колькі неабходна.

З сардэчнымі прывітаннямі і вялікай павагай,

Беатэ Мюлер-Гемэке